традиции драматическими театрами Беларуси (спектакли «Дай воды, колодец», режиссёр Ю. Фридман, ТЮЗ, 1971; «Тутэйшыя», режиссёр Н.Пинигин, НАТ им. Я. Купалы, 1989; «Дитя из Вифлеема», режиссёр Н.Пинигин, Театр-студия киноактёра, 1993; «Царь Ирод», режиссёр А. Лялявский, Государственный театр кукол, 1993 и др.

«Народные кукольные традиции…. не должны превращаться в музейную марионетку, висящую на стене. … Нужны чуткие пальцы современного художника, который … заставит ее двигаться в новом времени, соединив с пластами других культур. Тогда не умрут и традиции, надеясь на новые поколения творцов и зрителей, ибо суть современного театрального процесса – не формальная сумма признаков, а нечто более глубинное – сам менталитет народа» [1, с. 12–15 ].

**Список литературы:**

1. Барышев Г., Лашкевич Ж. Прошлое и настоящее белорусской батлейки. Театр Чудес. – М., 2001. – № 1. – С. 12–15.
2. Гісторыя беларускага тэатра ў 3 т. – 4. Кн. Т. 1. Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. / [М. Каладзінскі, А. Мальдзіс, І. Ягорава і інш. ; рэдкал. : У. Няфёд (гал. рэд.) і інш.]. – Мінск. : Навука і тэхніка, 1983. – 496 с., іл.

*Юрый Барадзін*

## ЭКЗІСТЭНЦЫЯЛ УСЕАГУЛЬНАЙ БАГІНІ-МАЦІ СВЕТУ Ў БЕЛАРУСКАЙ І СКАНДЫНАЎСКАЙ МІФАЛОГІІ

*У артыкуле раскрываюцца агульныя рысы архетыпу Багіні-Маці, агульныя сувязі і падабенствы паміж беларускай і скандынаўскай міфалогіяй, а таксама падабенствы беларускіх і скандынаўскіх багіняў, іх мацярынскія каштоўнасці, паколькі культ Багіні-Маці ў развіцці здольны набыць рысы культу Зямлі і ўрадлівасці.*

*Yurij Borodin*

## EXISTENTIAL THE MOTHER-GODDESS OF THE WORLD IN BELARUSIAN AND SCANDINAVIAN MYTHOLOGY

*The article reveals common features, archetypes of the mother goddess, common connections and similarities between Belarusian and Scandinavian mythology. And also, the similarities of the Belarusian and Scandinavian goddesses, their maternal values, since the cult of the Mother Goddess acquires features of the cult of the Earth and fertility.*

Мацярынства – важнейшы экзістэнцыял у культуры. Экзістэнцыялізм мацярынства атрымаў культурнае развіццё ў беларускай і скандынаўскай міфалогіі. Пра экзістэнцыялізм чалавечай свядомасці сведчыць вобраз усеагульнай маці свету – ад першапачаткова культу мацярынства і вобраз Усеагульнай Маці-Багіні [5].

У славянскай і беларускай міфалогіі вобраз Багіні-Маці прадстаўляюць: Маці-Зямля – маці ўсіх істот, раслін, урадлівасці; Маці-Грамаўніца – жонка Пяруна, якую яшчэ беларусы называюць «Цёця»; Мокаш (Мока) – багіня лёсу, шлюбу і родаў; Лада – багіня вясны, заступніца шлюбу і любові; Ражаніцы (бабы-павітухі) – жаночыя боствы ўрадлівасці, заступніцы роду, сям'і, якія вызначаюць лёс дзіцяці пры нараджэнні.

Вобраз Маці-Багіні ў скандынаўскай міфалогіі – гэта багіня зямлі – Ёрд, маці грамаўніка Тора, жонка вярхоўнага Одзіна; Фрыгг – жонка Одзіна, багіня дзетанараджэння, заступніца людзей, захавальніца хатняга ачагу; Бестла – маці вярхоўнага бога Одзіна, жонка бога Бора [1].

Маці-зямля – старэйшае боства ў беларускай і славянскай міфалогіі. Багіню Ладу, на погляд даследчыка Аляксея Ненадаўца, шануюць беларусы як вялікую багіню, і ў вусна-паэтычных творах да яе звартаюцца як да маці вясны: «*Благаславі, Божа, / Благаславі, маці, / Вясну заклікаці, / Зіму праважаці! / Благаславі, маці, / Ой, маці, Лада, маці, / Вясну, заклікаці*» [4]. Багіню Ладу называюць Ражаніцай, Маці Нябеснай і Сусветнай Маці. Яна – жонка Нябеснага Бацькі – Сварога. Яна парадзіла такіх багоў як Пярун (грамавік), Лёля (багіня вясны і кахання), Жыва (багіня лета). Як багіня вясны і багіня-маці Лада суадносіцца са скандынаўскай багіняй Фрэяй – дачкой бога ветру Ньёрда (з ім суадносіцца беларускі і славянскі Стрыбог) і сястрой-блізнюком бога сонца Фрэйра (суадносіцца з Дажбогам).

Жонка Ньёрда – багіня Скадзі, ад якой нарадзіліся блізнюкі – Фрэйр і Фрэйя [2]. Як Багіня-Маці Фрэйя разам з вярхоўным Усебацькам Одзінам дзеляць паміж сабой загінуўшых ваяроў. Яна прымае палову паўшых вікінгаў ва ўласны палац Фольькванг (са старажытна-скандынаўскай мовы «Folkvang» перакладаецца як «Поле Людзей», «Поле Войска», «Луг»), і ў галоўнай зале Фольькванга – Сесрумніры (Sessrumnir) упарадкавана рассажвае іх: «Фольккванг – девятый, / Там Фрейя решает, / Где сядут герои; / Поровну воинов, / В битвах погибших, / с Одином делит» (урывак з прамовы Грымніра ў перакладзе А. Корсуна) [6].

Фрэйя таксама правадырка валькірый, сімвал прыгажосці, менавіта, таму яе любяць усе скандынаўскія багі, і прызнаюць прыгажэйшай з усіх. Ёсць меркаванні, што калі Фрэйя плача, яе слёзы ператвараюцца ў золата. 10 студзеня ў Нарвегіі адзначаюць дзень Фрэйі як дзень нарвежскай багіні-маці. Са скандынаўскіх багіняў Фрэйя суадносіцца з багіняй Фрыгг, жонкай вярхоўнага Одзіна.

Фрыгг лічылася не толькі заступніцай шлюбаў, але каралевай і маці ўсіх багоў. Ёй падпарадкоўваліся закаханыя шлюбныя пары і любячыя бацькі. Яна адзіная, седзячы на прастоле Хлідск'яльв, магла сядзець побач з мужам-Одзінам. Маці Фрыгг – Ф'юргюн, якая суадносіцца з беларускай Багіняй-Зямлёй. У беларускай міфалогіі Багіня-Маці парадзіла бога вясны Ярылу, у скандынаўскай багіня Фрыгг ад Одзіна парадзіла бога вясны Бальдра, які суадносіцца з Ярылам. Фрыгг, як і яе маці Ф'юргюн, таксама суадносіцца з беларускай Маці-Зямлёй, як пачынальніца роду багоў. З беларускай Багіняй-Маці варта параўнаць яшчэ скандынаўскую багіню Ёрд – жонку Одзіна, маці грамавіка Тора, багіні свяшчэннай боскай зямлі. Сярод багіняў, якія пачалі іх радавод – Бестла, маці Одзіна, якая выйшла замуж за бога Бёра, спарадзіла вярхоўнага бога і з'яўляецца маці ўсіх асаў. Багіня Нанна – жонка бога вясны Бальдра. Нанна перакладаецца як «маці». Ад Бальдра яна спарадзіла Фарсэці, які быў богам справядлівасці і правасуддзя. Як справядлівы суддзя і бог суддзя ён суадносіцца з беларускім богам-Сварогам.

Мокаш – жонка Пяруна, вярхоўнага бога беларусаў і славян – як багіня шлюбу, родаў і ўрадлівасці, суадносіцца з Фрэйя, Фрыгг і жонкай Тора – багіняй Сіф [3]. Як параўнальныя рысы і падабенствы трэба адзначыць, што дзень багіні Мокаш у беларусаў, як



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і дзень багіняў Фрэйі і Фрыгт у скандынаваў, – пятніца. Сіф у скандынаўскай міфалогіі лічыцца другой багіняй прыгажосці пасля Фрэйі і Фрыгт, з залатымі валасамі. Як Багіня-Маці, яна спарадзіла скандынаўскага бога зімы Улля, які суадносіцца з беларускім богам зімы Зюзяй.

Ражаніцы (бабы-павітухі) у беларускай і славянскай міфалогіі суадносяцца са скандынаўскай Гев'ён – заступніцай маладых дзяўчат, і багіняй Лові, якая як і Фрэйя, багіня любові і міласэрнасці, і дапамагае ўз'ядноўвацца закаханай пары – хлопцу і дзяўчыне дзеля жаніцьбы, стварэнню сям'і і працягу радаводу.

Карл Густаў Юнг, швейцарскі вучоны, даследаваў Архетып Маці і вобраз Вялікай Маці. Сам архетып – уяўленне пра першавобразы. Мноства варыянтаў архетыпа Маці, на погляд, Карла Юнга, дае міфалогія, у тым ліку і параўнальная. З архетыпам маці суадносяцца такія каштоўнасці, як мацярынскі клопат і спачуванне, боскасць жанчыны. Бо ўсё, што з'яўляецца дабрынёй і клопатам, спрыяе ўрадлівасці [7].

**Спіс літаратуры:**


1. Гербер, Х. Мифы Северной Европы / Хелен Гербер / М. : ЗАО «Центрополиграф», 2008. – 346 с.
2. Запорожченко, А. Сравнительная мифология / Андрей Запорожченко. – Новосибирск : НГПУ, 2013. – 197 с.
3. Калацэй, В. Параўнальная міфалогія / Вячаслаў Калацэй / рэд. С. Канановіч, рэц. Э. Дарашэвіч, У. Конан. – Мінск : Зорны верасень; Паркус Плюс, 2009. – 116 с. : іл.
4. Ненадавец, А. Міфалогія маіх продкаў / Аляксей Ненадавец. – Чарнігаў : Всесвіт, 2009. – 400 с.
5. Рагуля, А. Этнічны семіёзіс і нацыянальная дактрына / Аляксей Рагуля. – Мінск : Выд-ва В. Хурсіка, 2018. – Кн. 1. Этнасеміётыка. – 220 с.
6. Фолькванг // Ru.wikipedia.org [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://ru.wikipedia.org/wiki/%D0%A4%D0%BE%D0%BB%D1%8C%D0%BA%D0%B2%D0%B0%D0%BD%D0%B3. – Дата доступу : 20.03.2020.
7. Юнг, К. Г. Душа и миф : шесть архетипов / Карл Густав Юнг. – М. : ЗАО «Совершенство», 1997. – 384 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ